Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 16 (657). Wilnia, Niadziela 5 Krasawika 1936 h. Hod XII (XX)

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Padpiska u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Беларусы дамагаюцца роднае школы!

Цьвёрда і настойліва йдзе Беларускі народ да лепшае долі. Думка жыць так, як і ўсе культурныя народы жывуць, глыбака закаранілася ў народныя масы. Усе сьведамыя Беларусы дружна ўзяліся за працу на роднай ніве. Але каб збудаваць лепшую будучыню, трэба здабыць сваю родную, беларускую школу. Беларусы гэта разумеюць і сваей роднай школы дамагаюцца.

Сёлетні год беларускае грамадзянства пасьвячае справе сваей роднай беларускай школы. З гэтай нагоды варта прыпомніць, хоць збольшага, што для гэтай справы рабілі беларусы ў мінуўшчыне і што яны робяць ды што рабіць павінны сяньня.

Справа беларускай школы ня новая. Яна больш-менш зьвязана з пачаткамі беларускага адраджэньня. Ужо першыя нашы культурныя і палітычныя працаўнікі забіралі голас аб беларускай школе, выдавалі адпаведныя беларускія чытанкі для дзяцей, даказвалі патрэбу для беларусаў іх роднай школы, а так-жа будзілі ў цёмных, сонных беларускіх масах зразуменьне важнасьці сваей школы і яе жаданьне.

Гэтыя агульныя яшчэ, толькі тэорэтычныя, беларускія імкненьні да роднай школы, пачынаючы ад 1905-6 году, ужо пакрысе ставаліся фактам, нязначна ўваходзілі ў жыцьцё. Так напр. у гэтым часе беларусы-вучыцялі пад кіраўніцтвам цяперашняга вялікага беларускага народнага паэта Якуба Коласа тайком ад вока царскай паліцыі сям-там вучылі беларускіх дзетак у іх роднай мове.

Падчас вайны (1915—17), на беларускіх землях, занятых нямецкім войскам, беларускіх школ ужо йснавала нешта да 150. У гэтым часе ўжо існавала й беларуская вучыцельская сэмінарыя ў Сьвіслачы.

Пасьля нямецкай акупацыі, падчас улады „Zarządu Ziem Wschodnich" так-жа йснавалі яшчэ дзесяткі беларускіх школ.

Існавалі беларускія школы й былі пачаўшы буйна разьвівацца падчас улады «Сярэдняй Літвы». У гэным часе беларускіх школ налічалася нешта каля 200.

Калі-ж гэтых школаў нястала, народ беларускі, разам з сваей інтэлігенцыяй, аб патрэбе беларускай школы не забываўся й яе ад польскіх школьных уладаў дамагаўся.

Так напрыклад, пасьля 1924 году беларусы згодна з гэтак зв. «ustawami językowemi» (31.VII.24) падалі польскім уладам дэклярацыяў на 412 беларускіх школ. Пасьля гэтага беларусы так-жа падавалі многа дэклярацыяў.

Тымчасам у польскіх газэтах пачалі штораз часьцей паяўляцца галасы, што беларусы ня маюць сваей школы, бо яе ня хочуць. Ясна, беларускія газэты пярэчылі гэтаму, але справе школы гэтым, на жаль, не маглі памагчы нічога.

Урэшце аб гэтым летась у лістападзе месяцы, сказаў сваё слова і Куратар Віленскага Школьнага Вокругу. Пасьля слоў Куратара беларускае грамадзянства пастанавіла яшчэ раз выявіць волю пажаданьня роднай школы.

Між беларусамі розных кірункаў пачаліся ажыўленыя нарады аб справе роднай школы. У выніку гэтых нарадаў сярод беларусаў паўстаў супольны школьны фронт, заданьнем якога — барацьба за родную беларускую школу. Барацьбе гэтай пасьвячаецца ўвесь сёлетні год. Існуе ўжо патрэбная для гэтай акцыі літаратура: адозвы, плякаты, дэклярацыі, інструкцыі. Пачалася ўжо і праца.

Дык натужма-ж усе нашы беларускія сілы, каб супольна бароцца за сьвятую справу роднай беларускай школы! Супольнымі сіламі да супольнай працы!

Пры гэтым зварочваем увагу на магчымыя рознага роду правакацыі з боку цёмных сілаў на ніве барацьбы за родную школу й дзеля гэтага заклікаем сьцісла трымацца правапарадку паказанага ў інструкцыі, выданай Беларускім Інстытутам Гасп. і Культуры і Т-вам Бел. Школы, як дамагацца дзяржаўнай публічнай беларускай школы на падставе закону ад 31.VII. 1924 г. і распараджэньня Міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы ад 7.I.1925 г.

Аб працы сваей на беларускім школьным фронце, аб перашкодах, аб выніках і г. д., словам, аб усім, паведамляйце беларускі школьны сакратарыят: Вільня, Каралеўская: 3—8. Гэты-ж сакратарыят на жаданьне бясплатна высылае ўсе патрэбныя друкі.

25 САКАВІКА 1936 Г.

Кожны год Беларусы радасна вітаюць 25 сакавік. У гэты дзень што год у Вільні ў сьвятынях адбываюцца ўрачыстыя набажэнствы, падчас якіх беларусы зварочваюцца з гарачай малітвай да Усёмагутнага, каб Ён пераманіў цяжкі лёс Беларускага народу. 25 сакавіка што год усе беларускія арганізацыі, якіх найбольшым ідэалам ёсьць — Вольная і Незалежная Беларусь — ладзяць урачыстыя акадэміі. Што год у дзень 25 сакавіка, што раз мацней б'е беларускае сэрца. 25 сакавіка ўвесь Беларускі народ думкай ськіроўваецца ў сталіцу Беларусі — Менск, дзе ў 1918 г. было абвешчана ўсяму сьвету Яго найбольшае жаданьне — быць гаспадаром на сваей зямлі.

Сёлета, так як і ў мінулых гадох, Беларусы загадзя прыгатаўляліся да свайго найбольшага нацыянальнага сьвята — 25 сакавіка — да сьвяткаваньня 18-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі. 22 сакавіка Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, як рэпрэзэнтант арганізаванага беларускага грамадзянства, апублікаваў адпаведны камунікат, заклікаючы ўсіх Беларусаў, а прадусім беларускія арганізацыі, належна ўшанаваць дзень 25 сакавіка.

У Вільні Бел. Нац. Камітэт пастанавіў наладзіць сьвяткаваньне 18-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ў нядзелю 29 сакавіка сёл. ў залі БІГіК у наступным парадку: а гадз. 19 мелася адбыцца ўрачыстая акадэмія, на якой мгр. М. Шкялёнак прачытаў-бы рэфэрат на тэму: „Абвешчаньне Незалежнасьці Беларусі", а пасьля рэфэрату меў быць канцэрт.

Апрача камунікату Бел. Нац. К-ту, беларуская прэса пасьвяціла многа артыкулаў Акту 25.III.1918.

І вось прыйшоў дзень 25 сакавіка. У гэты дзень ў Пятніцкай царкве ў Вільні адбыўся малебен за Беларускі народ. Пасьля набажэнства ў царкве, адбылася ўрачыстая акадэмія ў беларускіх скаўтаў — у памешканьні X-тай дружыны Ім. Фр. Багушэвіча ў Вільні. Акадэмію гэту пачаў друж. Бразоўскі адчытаньнем загаду беларускім скаўтам на дзень 25 саквіка, у каторым сказана было, каб скаўты, помнячы аб Вялікім Акце 25.III.1918, верна служылі сваей Бацькаўшчыне і ў кожную хвіліну былі гатовы ў абароне Яе аддаць жыцьцё. Пасьля гэтага скаўт У. Кароль прачытаў рэфэрат аб гісторыі беларускага скаўтынгу, а грам. Ч. Найдзюк на тэму: „Акт 25.III.1918, як Ідэал Беларускага Нацыянальнага Адраджэньня". Апрача рэфэратаў былі дэклямацыі беларускіх вершаў і выступаў скаўцкі хор. На заканчэньне прывітаў беларускіх скаўтаў старшыня Гуртка Прыяцеляў Беларускіх Скаўтаў у Вільні кс. др. Ст. Глякоўскі.

Увечары адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 25 сакавіка ў Беларускай Філіі дзяржаўнай гімназіі ім. Ю. Славацкага, каторае ладзіла бел. вучнёўская моладзь.

* * *

А гадз. 20 мін. 30 па радыё з Літвы (з Коўна) разьнесьліся па цэлым сьвеце гукі беларускага нацыянальнага гімну. Там гэтай парой пачыналася ў радыё сьвяткаваньне беларускага народнага сьвята. Перш была прамова ў літоўскай мове, а пасьля ў беларускай і францускай. Потым дэклямаваліся беларускія вершы, выступаў беларускі хор пад кіраўніцтвам А. Матача і йграў беларускія мэлёдыі струнны квартэт. Трывала ўсё гэта болей гадзіны.

Урачыста сьвяткавалі 25 сакавік і Беларусы на эміграцыі ў Чэхаславаччыне і ў іншых краёх.

* * *

У нядзелю 29 сакавіка сёлета а 9 гадз. у касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні адбылося ўрачыстае набажэнства, падчас якога хор пяяў беларускія рэлігійныя песьні. На набажэнстве гэтым быў Старшыня Літоўскага Нац. К-ту ў Вільні грам. Сташыс. Па набажэнстве Кс. Ад. Станкевіч сказаў адпаведнае да бел. народнага сьвята казаньне. На заканчэньне прысутныя ў касьцеле адсьпявалі беларускі рэлігійны гімн „Божа што калісь народы".

Зблізіўся ўжо вечар і азначаная гадзіна акадэміі БНК. Людзі зьбіраліся на Завальную 1 у залю БІГіК, дзе аднак чакала іх неспадзяваная абвестка наступнага зьместу:

„Uwaha! Akademija Bieł. Nac. Kamitetu ŭ 18-tyja ŭhodki Abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi, jakaja miełasia adbycca 29.III a hadzinie 19-taj, adklikajecca dziela zabarony administracyjnaj ŭładaj".

З гэтай прычыны акадэмія Бел. Нац. К-ту не адбылася.

* * *

У сувязі з беларускім народным сьвятам Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні атрымаў прывітальныя пісьмы: з Чэхаславаччыны ад Беларускай Рады ў Празе, ад старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі; з Бэрліна ад беларускіх студэнтаў, з правінцыі ад паэта Міхася Машары, кс. В. Шутовіча, др. Т. Куніцкага, Я. Шэйбака і Г. Верамея; з Вільні ад кс. В. Талочкі, і інш.

* * *

У канцы трэба сьцьвердзіць, што ня гледзячы на ўсе няспрыяючыя варункі, беларускі нацыянальна-вызваленча-адраджэнскі рух магутнее і прыбліжаецца да сваe мэты...

Чанк.

Палітычны працэс

Засудзілі беларусаў, якія гуртаваліся каля „Бел. Газэты" і „Асвы"

У мінулым тыдні, як мы ўжо пісалі, адбываўся ў Віленскім Акружным Судзе, палітычны працэс. Падсудныя абвінавачаны з артыкулу 97 у лучнасьці з арт. 93 Карнага Кодаксу. — Працэс кончыўся. Прыгавор прачытаны дня 31.III.

Пакараны вастрогам: на 8 год: А. Карповіч, Я. Міска, В. Таўлай; на 6 год: Я. Патаповіч, П. Радзюк, Я. Пестрак і А. Потажнік; на 4 гады: Діна Мадэйскер і Рэдзька; на 3 гады: Т. і Л. Будзіновічы і Разаля Крыштапаніс; на 2 гады — С. Вішнеўская. Тімафееў прызнаны невінаватым.

Апроч таго, пакараныя пазбаўленыя публічных і грамадзянскіх правоў на час ад 5 да 8 год.

Кара вастрогу на падставе амнэстыі зьменшана на траціну.

Пакараныя падалі апэляцыю.

Засуджаныя Патаповіч, Я. Пестрак, В. Таўлай і Рэдзька — зьяўляюцца пачынаючымі беларускімі паэтамі.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury

Charki, Pastaŭski paw. Dnia 9.II. h. h. adbyłosia ahulnaje sabrańnie hurtka Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ w. Charki, Pastaŭskaha pawietu, z takim paradkam dnia:

1) Wybary staršyni sabrańnia, 2) adčytańnie pratakołu apošniaha sabrańnia, 3) sprawazdača z dziejnaści hurtka za 1935 h., 4) wybary Uradu hurtka, 5) plan pracy na budučyniu, 6) wolnyja prapazyki.

1) Sabrańnie adčyniŭ staršynia hurtka J. Krasoŭski i zaprapanawaŭ wybrać staršyniu sabrańnia. Sabrańnie wybrała na staršyniu J. Łapačonka. Staršynia paklikaŭ na sakratara Michasia Kazaraŭca i prystupiŭ da dalejšych punktaŭ paradku dnia.

2) Pratakoł apošniaha ahulnaha siabroŭskaha sabrańnia adčytaŭ sakratar M. Kazarowiec, jaki sabrańnie pryniało da wiedama.

3) Sprawazdaču z dziejnaści hurtka za minuły hod zdaŭ ad imieni Uradu hurtka sakratar Uradu, z čaho sabrańnie dawiedałasia, što Urad adbyŭ dwa pasiedžańni, naładziŭ dwa pradstaŭleńni. Kasa hurtka maje hatoŭki 23 złoty 20 hr. Siabroŭ naličwajecca 10.

4) U Urad hurtka na 1936 h. wybrany nastupnyja asoby: 1) Staršynia— Jachim Krasoŭski. 2) skarbnik— Julian Łapačonak, 3) sakratar— Wiktar Kazarowiec. U zastupniki: 1) Ściapan Kiejzik i 2) Zenon Kazarowiec.

5) Plan pracy na budučyniu:

Pastanoŭlena staracca pamahčymaści pašyrać kulturna-praświetnuju pracu, ładziačy pradstaŭleńni i publičnyja lekcyi na roznyja temy, a tak-ža pašyrać biełaruskuju litaraturu. Źwierniena ŭwaha na abawiazkawaje apłačwańnie siabroŭskich składak. Daručana ŭradu hurtka zapranumerawać časapisy haspadarčaha i litaraturnaha kirunku: „Samapomač,“ „Kałośsie“ i inšyja.

Miadźwiedzičy, Baranawickaha paw. Sprawazdača z dziejnaści hurtka BIHiK u Miadźwiedzičach za 1935 h.

Dnia 15.III.1936 h. adbyŭsia ahulny schod siabroŭ hurtka. Paradak dnia byŭ nastupny.

1) Sprawazdača ŭradu hurtka z dziejnaści za minuły 1935 hod, 2) wybary nowaha ŭradu, 3) biahučyja sprawy.

1) Dziejnaść hurtka za 1935 h. wyhladaje tak: a) adbyłosia 2 pasiedžańni ŭradu hurtka, b) adno sabrańnie siabroŭ hurtka dnia 25-ha sakawika 1935 h., na katorym byŭ pračytany referat siabroŭki M. Tatarynowičanki na temu „Metody sučasnaha chatniaha nawučańnia,“ c) pašyrałasia biełaruskaje drukawanaje słowa ŭ susiednich wioskach.

Hurtok nia moh na bolšuju skalu raźwiwać swajej dziejnaści z pryčyny roznych pieraškod, a tak-ža z niastačy adpawiednaha lokalu, dzie hurtok moh-by ładzić publičnyja lekcyi-referaty, ci spektakli-wiečaryny.

2) U nowy ŭrad wybrany: 1) Jazep Tatarynowič (w. Kuršynawičy) — staršynia; 2) skarbnik — Stanisłaŭ Karšun (w. Hajnin); 3) sakratar — M. Tatarynowičanka (w. Hajnin); zastupniki: Jan Bubieńčyk (w. Haradzišča) i Jazep Kasparowič (w. Hajnin). Na biblijatekara wybrany Jan Bubieńčyk.

3) U biahučych sprawach pastanoŭlena: 1) prawodzić školnuju akcyju i źbirać podpisy na biełaruskuju školu; 2) źładzić akademiju na 25 ha sakawika h. h. z referatam z haliny historyi Biełarusi; 3) wykasawać niekatorych siabroŭ, a imienna tych, katoryja nie prajaŭlajuć nijakaj dziejnaści, ani pačuwajucca da swaich abawiazkaŭ u płačeńni siabroŭskich składak.

4) Pastanoŭlena pryniać u lik siabroŭ Kazimiera Saroku

Na hetym schod začyniena.

Забойства спадцішка на Валыні

Надовячы ў Чарукаве, Луцкага пав. няведамыя асобы напалі на польскіх асаднікаў і забілі асадніка Станіслава Кравчыковскага. Пахованы забітага адбыліся вельмі ўрачыста: над магілай нябожчыка прамаўлялі прадстаўнікі таварыства асаднікаў і прадстаўнікі „Кракуса.“

Валынская санацыйная прэса прадстаўляе гэтае забойства, як чын падпітых хлапцоў, якія мелі з Кравчыковскім нейкія асабістыя справы, а эндэцкі „Lwowski Dziennik Narodowy“ піша, што нябожчыка-асадніка забілі украінскія „молойцы“ і што гэтае забойства ўзбудзіла сярод палякоў на Валыні прыгнабленьне. Пакульшто ў Чарукаве арыштавана некалькі хлапцоў, і хіба сьледзтва выясьніць справу забойства спадцішка.

Апэляцыйны суд Бандэры, Лэбэда і іншых

Засуджаныя ў ведамым працэсе ў Варшаве украінцы: Бандэра, Лэбэд, Клымышын і Підгайны на дасьмертную катаргу, Гнатківска і Зарыцка на 15 гадоў, а так-жа й усе йншыя, падалі апэляцыю. Гэтую справу Варшаўскі апэляцыйны суд мае разглядаць 27 г. м.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларускую Крыніцу!“

Z dziejnaści litoŭskaha T-wa „Rytas“

22.III. sioleta ŭ Wilni adbyŭsia hadawy schod siabroŭ praświetnaha T-wa „Rytas“. Na hetym schodzie ab dziejnaści T-wa zrabiŭ sprawazdaču staršynia Ks. K. Čibiras. Iz sprawazdačy wyjaśniłasia, što ŭrad T-wa ad 12.V.1935 da 22.III.36 adbyŭ 9 pasiedžańniaŭ, na jakich byli razwažanyja biahučyja sprawy T-wa. U 1935—6 školnym hodzie T-wa ŭtrymliwała litoŭskuju himnaziju im. Witaŭta Wialikaha ŭ Wilni, 4 pačatkawyja škoły i 101 čytalniu. U 1935 h. zahadam Kuratara było začyniena 13 pačatkawych škoł. Aprača hetaha apošnim časam było spyniena i začyniena 20 čytalniaŭ. Ad 81 da 22.III sioleta byli spynieny i začynieny čytalni ŭ 24 miascoch Wilenskaha wajawodztwa. Takim čynam ciapier T-wa maje 4 pačatkawyja škoły (z 173 dziaćmi) i 77 čytalniaŭ.

U biblijatekach-čytalniach T-wa „Rytas“ znachodzicca 15.516 knih. Z hetych — 12.108 knih naležać da pastajannych biblijatekaŭ, a 4.408 — da ruchomych.

Urad T-wa ŭ 1935 h. mieŭ na mecie arhanizawać pa wioskach pry čytalniach kursy. Kuratar na heta zhadziŭsia. Ale kali byli składanyja ŭ Kuratoryju prośby, dyk ni na adnu nia było adkazu. Tady zacikaŭlenyja zwaročwalisia ŭ Starastwy, ale tut kazali, što treba zwaročwacca ŭ Kuratoryju.

Apošnim časam było wysielena dalej ad administracyjnaj linii 10 kiraŭnikoŭ čytalniaŭ. Da taho byli jany pakarany štrafam, niekatoryja pa 3 załatoŭki. Usie wydaleny na try hady.

U niekatorych wioskach z čytalniaŭ byli pazabirany radjoadbiorniki, a ŭ niekatorych adniaty dazwoł trymać takoje radjo. Niekatorym sialanam u Lidzkim paw., nałažyli padatak bolš jak pa 100 załatowak.

U 1935 h. letam kiraŭnikom čytalniaŭ byli arhanizawanyja miesiačnyja kursy, na jakich była nawuka haspadarki, sportu, śpiewu i inš. U tym ža samym hodzie 2—15 śniežnia byli naładžany tym-ža kiraŭnikom čytalniaŭ kooperatyŭnyja kursy.

Ab himnazii im. Witaŭta Wialikaha ŭ Wilni zrabiŭ sprawazdaču dyr. M. Šikšnys. Z hetaj sprawazdačy dawiedwajemsia, što sioleta ŭ miesiacy studni ŭ himnazii byli 222 wučni: 150 chłapcoŭ i 72 dziaŭčyny. Usie wučni litoŭskaj nacyjanalnaści. 136 wučniaŭ z wiosak, a 86 — z miesta.

Bolšaść, 60 prac. pradmietaŭ u hetaj himnazii wykładajecca palitoŭsku, 30 prac. papolsku i 10 prac. paniamiecku.

Himnazija maje swaju biblijateku, u jakoj jość 7139 knižak. Z hetych — 1969 knih dla wučycialoŭ, a rešta — dla wučniaŭ; 3350 knih litoŭskich, 1372 — polskich i 448 niamieckich.

Hetak bolš-mienš wyhladaje dziejnaść T-wa „Rytas“.

Z „Viln. Ryt.“ Nr. 26, 1936. *P. Ł—č.*

Wajna ci mir?

Złamańnie Niamieččynaj Wersalskaha i Lokarnaŭskaha dahaworaŭ dy absadžeńnie niamieckim wojskam nadrejnskaj pałasy, staić dalej u asiarodku suświetnaj palityki. Ad wyrašeńnia hetaj sprawy zaležyć wajna i supakoj ŭ ciapierašniaj Eŭropie. Dziela hetaha i źwierniena ciapier usia ŭwaha palityčnaha świetu ŭ bok Londanu, dzie adbywajecca palityčny kirmaš eŭrapejskich wialikich dziaržaŭ. Tarhujucca dziaržawy adkryta i skryta — aficyjalna i tajna. Hetyja palityčnyja narady pakazwajuć, što ŭ palitycy ličacca tolki z siłaj i što tolki pad jaje naporam možna asiahnuć zdabyčy. Kab Niamieččyna nia była hetak azbrojenaj, jak jana jość, dyk u Londanie narady doŭha nie ciahnulisia-b i nadrejnski wokruh byŭ-by ŭžo ačyščany ad niamieckaha wojska. Ale Hitler swaje słowy prypiačatwaje siłaj armii i floty — dyplomaty-ž inšych dziaržaŭ tolki haworać, pastanaŭlajuć, naradžajucca, wydajuć prysudy i hetym kančajuć swaje zachady suproć niamieckaj padhatoŭki da militarnaj ekspansii. A Niamieččyna nastojliwa robić nastup i zdabytyja pazycyi ŭkraplaje.

Niamieččyna na nowych pazycyjach.

Niamieččyna paśla złamańnia Wersalskaha i Lokarnaŭskaha traktataŭ dy zaniaćcia zdemilitaryzawaj pałasy nad Rejnam stanuła na nowyja pazycyi, z jakich budzie wieści dalejšy nastup. Nastup na hetyja pazycyi dla Niamieččyny byŭ wielmi niebiaśpiečny. Francyja mieła prawa hety niamiecki nastup zapynić aružnaj siłaj. Ale, jak bačym, pabajałasia i hetaha nie zrabiła. Aprača hetaha, Francyja pad naciskam Anhlii zrakłasia swajho damahańnia, kab Niamieččyna wywieła swajo wojska z wokruhu nad Rejnam. Takim čynam Niamieččyna ŭstalawałasia na nowych pazycyjach i ciapier zajaŭlaje, što hatowa hawaryć z usimi dziaržawami ab dalejšym losie miru ŭ Eŭropie, hatowiačysia hetak da pachodu na eŭrapejski ŭschod.

Niamieččyna za swaje pastupki abwiniaje Francyju.

Na damahańnie Anhlii, jakaja swajej rolaj pasiarednictwa miž Francyjaj i Belhijaj z adnaho boku, a Niamieččynaj z druhoha, pryčyniłasia nia mała, što apošniaja hładka, pakulšto, wyjhrała hetuju sprawu — pryjechaŭ u Londan u Radu Lihi Narodaŭ pradstaŭnik Niamieččyny, jaki, budučy abwinawačanym, zamiest apraŭdywacca, abwinawaciŭ za pastupki niamieckaha ŭradu Francyju.

Jon zajawiŭ — Francyja zaklučyła z SSRR wajskowy sajuz. Da hetaha sajuzu dałučyłasia Čechasławaččyna. Hetyja try dziaržawy tworać siłu 200 milijonaŭ nasielnictwa i sajuz najmahutniejšaj u świecie wajennaj siły. A hety sajuz staić procia Niamieččyny. Dziela hetaha Niamieččyna

Instrukcyja — parada,

jak twaryć arhanizacyi Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia (BNA).

(*Praciah, hl. „Bieł. Krynica“ Nr. 15*).

IV. Jak arhanizawać BNA.

U arhanizacyju BNA mohuć ustupać biełarusy, mužčyny i žančyny, ad 18 hadoŭ. Pryjmać treba ludziej peŭnych, sialan, rabotnikaŭ i intelihiencyju, katoryja pryniasuć karyść swajej pracaj. *Treba hladzieć, kab u arhanizacyju nie dałučyŭsia jaki awanturnik z inšaj arhanizacyi,* bo jon budzie tolki raźbiwać pracu i rabić pastajannuju kałatniu i pieraškody.

Treba wyścierahacca taksama prawakataraŭ, jakija mohuć nahawaryć pierastupić zakon, kab hetym raźbić arhanizacyju.

Hałoŭnaje, treba kab usie dziejačy, pracaŭniki i paasobnyja siabry Bieł. Nar. Abjednańnia *dakładna wiedali zakonnyja padstawy ab palityčnych arhanizacyjach,* a taksama i ab sabrańniach publičnych i niapubličnych.

V. Jak sklikać sabrańni?

Z taho, što ŭžo skazana, widać, što nijakaj lehalizacyi abo dazwołu na arhanizacyju hurtka palityčnaj arhanizacyi nia treba. Ale ŭsiaki razumieje, što niemahčyma zarhanizawać Hurtok, nia sklikaŭšy sabrańnia, — zatym treba pahawaryć *ab sabrańniach.* Sprawa heta duža ważnaja i zatym treba dobra ŭčytacca i zapamiatać usie zakony ab sabrańniach, schodach (zgromadzeniach).

Pawodle zakonu ŭsie sabrańni možna padzialić na: publičnyja i niapubličnyja.

Publičnyja sabrańni roźniacca ad niapubličnych tym, što na publičnych sabrańniach:

a) arhanizatary nia wiedajuć, kolki na sabrańni jość usich prysutnych asobaŭ;

b) proźwiščy ŭčaśnikaŭ sabrańnia niawiedamy arhanizataram sabrańnia,

c) publičnyja sabrańni adbywajucca pad adkrytym niebam abo ŭ pamieškańniach, specyjalna dla publičnych schodaŭ pryznačanych (teatry, zali i h. d.),

d) ab ładžańni publičnaha sabrańnia treba *padać na piśmie* administracyjnaj ŭładzie pawiedamleńnie najmienš za 2 dni prad sabrańniem.

Sabrańnie niapubličnaje heta:

a) sabrańnie asob wiedamych asabista arhanizataru abo staršyni sabrańnia, jakoje adbywajecca ŭ pamieškańni;

UWAHA: Pamieškańniem (lokal), pawodle 3 art. zakonu ab sabrańniach, jość nia tolki niejkaja chata, ale i ŭwieś razam abharodžany panadworak, jaki da hetaj chaty naleža i tworyć z joj adnu całaść.

b) sabrańnie siabroŭ lehalna isnujučaj arhanizacyi (zrzeszenia), jakoje adbywajecca ŭ pamieškańni.

Hetkija sabrańni nia wymahajuć ani dazwołu ŭłady, ani pawiedamleńnia ab ich ułady.

Padstawa: art. 18 i 19 zakonu z dnia 11 sakawika 1932 h. ab sabrańniach (Dz. U. R. P. Nr. 48 poz. 450).

Jak widzim, palityčnyja hurtki, pawodle zakonu, mohuć rabić niapubličnyja schody swaich siabraŭ biez pawiedamleńnia ŭłady.

VI. Jak wieści sabrańni.

Arhanizatar sabrańnia najčaściej bywaje i staršynioj sabrańnia. Kali ŭžo narod sabraŭsia i nadyjšła aznačanaja ŭ pawiedamleńni hadzina, staršynia adkrywaje sabrańnie, naprykład, takimi sławami:

„Adkrywaju sabrańnie, prahrama našaha sabrańnia budzie takaja (tłumačyć pa punktach prahramu, kab ludzi wiedali, ŭ čym sprawa), a potym kaža: „daju prawa hołasu takomu i takomu“... I tak, paparadku, staršynia daje prawa hołasu kožnamu, chto choča wyskazacca ŭ danaj sprawie.

Pa pieršym pramoŭcy mohuć hawaryć i druhija, adzin za adnym. Staršynia sabrańnia dajeć słowa. Treba, kab pytańniaŭ ad ludziej było čym bolš, a kirujučy schodam staršynia, abo druhija siabry, dajuć adkazy na ŭsie zapytańni. U kancy pryjmajucca rezalucyi.

Na pieršym-ža sabrańni treba wybrać staršyniu, sakratara i skarbnika nowastworanaha Hurtka. A wykonwać farmalnaści dla stałych siabroŭ BNA ŭžo pawinien sakratar: sabrać deklaracyi, adasłać ich u Centralny Sakrataryjat, atrymać partyjnyja bilety BNA i razdać deklarantam, śpisać pratakoł sabrańnia i h. d.

Pratakoł stwareńnia Hurtka Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia možna pisać hetak:

Wybary ŭ Niamieččynie.

U niadzielu 29 sakawika adbylisia ŭ Niamieččynie wybary ŭ Rajchstah. Wybarščykaŭ zapisana było 45.408.191. Hałasawała 44.932.038.

Za śpisak Hitlera było hałasoŭ— 44.389 146. Prociŭ śpisku Hitlera — 542.898

Pawodle hetaha hałasawańnia za Hitlera staić u Niamieččynie 99 procantaŭ usiaho narodu. Kali tam nie padsypali hałasoŭ, jak heta rabili ŭ inšych krajoch, dyk Hitler maje ŭpłyŭ u niamieckim narodzie taki wialiki, jakoha ni adzin jašče na świecie dyktatar nia mieŭ.

SSRR budzie pamahać Francyi.

Balšawiki za supracoŭnictwa z Polščaj.

Staršynia Rady Kamisaraŭ SSRR, Mołataŭ pradstaŭniku francuzkaj presy, u hutarcy ab ciapierašnim pastupańni Niamieččyny, zajawiŭ — palityčnyja pastupki niamieckaha ŭradu nad Rejnam źjaŭlajucca hroznymi hałoŭna dla zachodnich dziaržaŭ. Pry hetym Mołataŭ adznačyŭ, što SSRR, zhodna z francuzka-sawieckim dahaworam, budzie Francyi pamahać wa ŭsim. Mołataŭ padčyrknuŭ tak-ža ab patrebie supracoŭnictwa balšawikoŭ z Polščaj, adznačajučy, što miž Polščaj i SSRR šmat jošć supolnych intaresaŭ.

Strełу i kroŭ na Dalokim Uschodzie

Na Dalokim Uschodzie supakoju niama. Tam biespraryŭna adbywajucca zbrojnyja wajskowyja napady, jakija byccam sumyśla prawakujuć wajnu.

Dnia 25 sakawika japonski azbrojeny wajskowy addzieł pierajšoŭ z Mandžuryi na sawieckuju terytoryju i pačaŭ stralać u balšawickuju wartoŭniu. Balšawiki pačali adstreliwacca i hetak razharełasia bojka. Na poli bitwy astalisia zabityja i ranienyja. Paśla hetaj pierastrełki japoncy adstupili, ale za niekalki hadzin uznoŭ pačali nastupać na balšawikoŭ. Japoncaŭ balšawiki prahnali kulamiotnymi strełami. Zabitych i ranienych było z abodwych bakoŭ.

Słowam, małaja wajna miž japoncami i balšawikami adbywajecca, jakaja moža raspalić wialiki wajenny pažar.

Hoład i tyfus na Paleśsi

Sioleta Paleśsie nawiedała katastrofa. Hałoŭny pradukt Paleśsia — heta siena. Hałoŭny prybytak palašukoŭ — heta rahataja skacina. Siena palašuki letam składajuć u stahi siarod bałota, a zimoj, kali bałota zamierźnie, siena z bałota wywoziać damoŭ. Sioleta była ciopłaja zima—nia było marozu, dyk palašuckaje siena zhinuła na bałocie. Palašuki stracili amal usio, što praz całaje leta zapracawali. Skaciny nia było čym karmić i jana pajšła za biascen, pradać z haspadarki palašuka što inšaje, kab kupić chleba, niama čaho. Hoład na Paleśsi šaleje ad Kalad, a razam z hoładam šyrycca hałodny tyfus.

Pradstaŭniki hazet, što jeździli ahladać ciapierašniaje žyćcio palašukoŭ, apiswajuć hetak: — starejšyja ludzi pawychodzili, u niekatorych miaścoch, z wiosak u lasy, kab tam pamirać, bo ŭ wioskach dla ŭsich pažywy nie chapaje, a małodšyja ludzi chawajuć pažywu dla siabie. U druhim miescy daśledžana, što sialanie źjeli padłu załzawataha kania.

Dziela ratawańnia ad hoładu našych i ukrainskich palašukoŭ padniata ratunkowaja akcyja — źbirańnie hrošaŭ. Źbirajuć hetyja achwiary i niekatoryja redakcyi hazet.

Ad siabie zaklikajem našych čytačoŭ da achwiarnaści na ratunak ad hoładu biełaruskich i ukrainskich palašukoŭ.

---

nie winawata za złamańnie Lokarnaŭskaha dahaworu, ale winawata Francyja.

Słowam, pradstaŭnik Niamieččyny abiarnuŭ kata dahary nahami, a Rada Lihi tolki wydała prysud, što Wersalski i Lokarnaŭski dahawory złamała Niamieččyna.

—o—

Paśla ścwierdžańnia Radaj Lihi Narodaŭ, što praŭnaja padstawa sučasnaha palityčnaha ŭ Eŭropie ładu—Wersalski traktat, Niamieččynaj złamany, sprawa miru ŭ Eŭropie zawiesiłasia ŭ pawietry i stwaryŭsia taki stan u mižnarodnaj palitycy, jaki wyrazić možna sławami — ni wajna ni mir.

Dalejšaja raźwiazka hetaha pałažeńnia, treba spadziawacca, pačniecca paśla zakančeńnia wybaraŭ u Niamieččynie.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы!—Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

Roznyja wiestki

Wyniki II dziaržaŭnaha pierapisu. Letaś my padawali wyniki II polsk. dziaržaŭnaha pierapisu ŭ Wileńskim wajawodztwie. Ciapier padajom hety wynik u Nawahradzkim wajawodztwie.

Woś-ža, pawodle padličeńnia Hałoŭnaha Statystyčnaha Uradu, na terytoryi Wilenskaha wajawodztwa ŭ II dziaržaŭnym pierapisie, što adbyŭsia ŭ 1931 h., **biełarusaŭ zapisana tolki — 287 938 asob.**

U Nawahradzkim wajawodztwie ŭ hetym pierapisie zapisana **biełarusaŭ**: u Nawahradzkim paw. — 102.932, u Staŭpieckim paw. — 39.278, u Baranawickim pawiecie — 66 093, u Baranawičach—2537, u Niaświskim paw. 76 286, u Lidzkim — 19 821, u Wałožynskim—32.716, u Słonimskim — 62.514 u Ščučynskim — 10.369.

Hetulki naličwaje ŭ hetych pawietach biełarusaŭ polskaja statystyka.

Kab choć dla hetych stojkich biełarusaŭ školnyja ŭłady adkryli ŭ dastatkawym liku biełaruskija škoły, dyk ich było-b nie 69, u jakich uziaty pad uwahu biełaruski jazyk, ale šmat bolš.

Z POLŠČY

Začynieńnie sesii Sojmu i Senatu. Pa zakančeńni razhladu ŭ sojmawaj i senackaj budžetnych kamisijach dziaržaŭnaha budžetu na 1936-37 h. Sojm i Senat hety budžet paćwierdzili. Paśla hetaha Sojm z Senatam dali ŭradu poŭnamoctwa wydawać zakony dekretami. Hetak zakončyłasia budžetnaja sesija Sojmu i Senatu, jakuju Prezydent u minułym tydni dekretam začyniŭ.

Pachowiny achwiaraŭ krywawaha strajku ŭ Krakawie. Krywawy krakaŭski strajk zakončyŭsia śmierciaj 8 asob. Na pachowinach hetych achwiaraŭ ludzkoha žyćcia sabrałasia kala 50 tysiač narodu.

Krywawaje zdareńnie ŭ Čenstachowie. Nadowiačy była tak-ža krywawaja sutyčka biezrabotnych demanstrantaŭ z palicyjaj u Čenstachowie.

Razhrom Centr. K-tu Polskaj Kamunistyčnaj Partyi. Nadowiačy palicyja wykryła kala Waršawy ŭ wioscy tajnuju kamunistyčnuju drukarniu, dzie znajšła šmat kamunistyčnaj litaratury, a tak-ža i mašyny da pisańnia. Aryštawana niekalki asob, byccam siabroŭ hetaj partyi, i skanfiskawana 18 tysiač zł. hrošaj. Hazety pišuć, što heta razhromleny Centr K-t Polsk. Kam. Partyi.

U źwiazku z hetym aryštawana ŭ Waršawie kala 100 asob zapadozranych u kamuniźmie

U Łodzkim wajawodztwie tak-ža wykryli šyrokuju dziejnaść kamunistaŭ—znajšli tajnuju drukarniu, mnoha kamunistyčnych afišaŭ i roznyja prylady dziela razmnažańnia adozwaŭ.

Z ZAHRANICY

Z italijanska-abisynskaha frontu wajny. Italijanskaje wojska na ŭsim froncie nastupaje na abisyncaŭ i pastupowa zajmaje dalej abisynskuju terytoryju. Italijancy z areplanaŭ daščentu zbombardawali abisynski horad Harrar. Abisyncy, baroniačysia źbili niekalki italijanskich areplanaŭ.

Bankroctwa niamieckaj dyktatury. Niamieckaje haspadarčaje žyćcio apynułasia ciapier u wielmi ciažkim pałažeńni. Hety haspadarčy kryzys — ćwierdziać niekatoryja palityki—asłablaje padstawy sučasnaj dyktatury ŭ Niamieččynie.

Sawiecka-manholski sajuz. Balšawickija hazety śćwiardžajuć, što SSRR z źwierchniaj Manholijaj zaklučyli wajenny sajuz uzajemnaj dapamohi. Hety sajuz nakirawany suproć ahresyi z boku Japonii.

Baraćba z kamunizmam u Japonii. Apošnimi časami japonski ŭrad raspačaŭ biezahladnuju baraćbu z kamunizmam. U minułym m-cy ŭ Japonii aryštawana 160 wydatnych kamunistaŭ

Z KRAJU

Razhrom kamunistaŭ. 1 krasawika palicyja dakanała rewizii ŭ Wilni ŭ zapadozranych u kamuniźmie, i jak padajuć hazety, znajšła mnoha kamunistyčnych materjałaŭ-drukaŭ. U Biełastockim wajawodztwie tak-ža adbylisia rewizii ŭ zapadozranych u kamuniźmie i aryštawana — u Biełastoku 29 asob, u Biełastockim pawiecie — 2 asoby, u Horadzienskim paw.— 26, u Sakolskim — 3, u Waŭkawyskim — 6 asob.

ЧЫТАЙЦЕ
адзіны ў Заходняй Беларусі беларускі літаратурна-навуковы квартальны часапіс

„К А Л О С Ь С Е“,

у якім зьмяшчаюцца творы перадавых паэтаў і пісьменьнікаў Заходняй і Усходняй Беларусі, а так-жа артыкулы навуковага характару.

Складка на асобную кніжку найменш 1 зл.

У 1935 г. выйшлі 4-ры кніжкі „Калосься“.

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі „КАЛОСЬСЯ“: Вільня, Завальная вул. №1—2.

P R A T A K O Ł

nowasarhanizawanaha Hurtka Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia ŭ wioscy (miastečku, mieście) . . . . . wołaści . . . . . . pawietu. Dnia . . . . . 1 9. . h. adbyłosia arhanizacyjnaje sabrańnie Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia, na jakim było prysutnych ahułam . . . asob, u tym liku z wioski . . . . asob, ... i z miesta (miastečka) . . . . asob . . . . pawietu.

Aznajomiŭšysia z prahramaj Biełaruskaha Nar. Abjednańnia, . . . asob zapisałasia da henaje lehalna, isnujučaje arhanizacyi, adnačasna adčyniajučy Hurtok BNA ŭ wioscy, (miastečku) . . . pawietu . . . Na staršyniu Hurtka wybrany (imia, proźwišča) . . . . z wioski . . . . . , na sakratara . . . . . . zmiastečka . . . . . na skarbnika . . . . z wioski . . . . . (Jasna, što i ŭsie z adnej wioski abo z adnaho miastečka mohuć być wybrany).

Pad pratakołam pawinny padpisacca, aprača troch wybranych u kamitet, jašče niekalki asob, abo nawat usie prysutnyja na sabrańni.

Hetyja prawiły, katoryja my ciapier padali, tyčacca wialikich publičnych schodaŭ. Ale musimo skazać, što nie zaŭsiody wialiki schod dobra ŭdajecca. *Časam lepiej zasnawać Hurtok pacichu, ładziačy mały schod prychilnikaŭ BNA.* Arhanizatary schodu zaklikajuć tady na schod swaich prychilnikaŭ i adnadumcaŭ kartkami, u katorych prosiać pryjści na arhanizacyjnaje sabrańnie BNA. Kartku zaprosinaŭ padpiswaje arhanizatar sabrańnia.

Kartku možna pisać choć-by hetkim paradkam:

Hramadzianinu (*imia i proźwišča*)
žycharu wioski (*miastečka*) . . . .
wołaści . . . .

Z a p r o s i n y.

Hetym prosim Was pryjści na arhanizacyjnaje sabrańnie Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia, jakoje adbudziecca dn. . . 19 . . h. u miastečku (wioscy) . . . . u domie (*imia i proźwišča haspadara domu*) a . . . hadzinie. Meta sabrańnia — zarhanizawańnie Hurtka BNA. u . . . .

Arhanizatar sabrańnia . . . (*podpis*)
dn. . . . 19 . . h.

Idučy na schod, hetu kartku treba mieć z saboju. Hetaki schod zawiecca *schodam pa zaprosinach*, ličycca *niapubličnym*. Paradak takoha sabrańnia hetaki samy, jak i bolšaha. Značyć: adkrywajecca sabrańnie, wyjaśniajecca meta sabrańnia, zaklikajecca da stwareńnia Hurtka BNA i robicca zapis siabraŭ. Paśla zapisu adbywajucca wybary kamitetu, pišacca pratakoł, pad pratakołam padpiswajucca prysutnyja siabry schodu, potym pratakoł pierapiswajecca, u hary stawicca słowa „kopija“ i heta kopija pratakołu pierasyłajecca ŭ centralny Kamitet BNA. Kopiju padpiswaje tolki sakratar. Na padstawie hetaj kopii Hurtok atrymaje adpawiedny dakument ab zaćwierdžańni jaho.

Sklikajučy taki mały schod, treba dobra pomnić, što ŭłady mohuć zaŭsiody spraŭdžać, ci schod nie źjaŭlajecca publičnym i ci meta schodu jošć takaja, jak padadziena ŭ pawiedamleńni. Dziela hetaha na taki schod usie pawinny prychodzić z kartkami zaprosinaŭ. Arhanizatar schodu pawinien dapilnawać hetaha.

Kali ŭžo Hurtok zarhanizujecca, to nijakich zaprosinaŭ nia treba, a siabry Hurtka źbirajucca na schod (abo na konferencyju), majučy pry sabie siabroŭskija bilety. I taki schod ličycca taksama niapubličnym.

VII. Abawiazki siabraŭ BNA.

U arhanizacyju BNA nia treba ciahnuć kožnaha abyjakoha čaławieka. Lepš mieniej, ale ludziej česnych i dobrych.

Kožny siabra Hurtka Biel. Nar. Abjednańnia pawinien dobra wiedać prahramu, arhanizacyjny statut BNA i instrukcyju.

Kab raźbiracca ŭ sprawach palityčnych, treba na kožnym sabrańni naładzić čytańnie hazet i dyskusyju na palityčnyja temy.

Najkaryśniej, kab chto z siabraŭ pryhatawaŭsia pierad schodam Hurtka i na schodzie zrabiŭ padrabiazny dakład ab palityčnaj sytuacyi. A kali heta jšče trudna, dyk kali chto dobra čytaje, niachaj pawažna pračytaje hazetu i wyjaśnić ważniejšyja artykuły z jaje, abo z prahramy.

Potym, kali chto čaho nie zrazumieŭ, niachaj u druhoha pytajecca, a druhi niachaj ŭsio wyjaśnić, kab adzin druhomu pamahaŭ.

(*Dalej budzie*).

Кожны беларускі гаспадар-земляроб чытае адзіны беларускі гаспадарскі часапіс

„САМАПОМАЧ“

Часапіс выходзіць рэгулярна што месяц, зьмяшчае ў сабе ўсякія гаспадарскія рады, весткі і каштуе з перасылкай на год толькі 3 зл.
на паўгоду . . . . 1.75 „
Адрас рэдакцыі: Вільня, Полацкая вул. 9—4

На шляху культурна-асьветнай працы.

(З Браслаўскага пав.).

Апошнім часам беларускія часапісы кладуць вялікі націск на культурна-асьветную працу сярод сялянства. Вось-жа прадусім трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на тыя цяжкія, няспрыяючыя абставіны, у якіх культурна-асьветная праца праводзіцца.

У 1926 годзе ў мястэчку Ікazьні, Перабродзкай вол. заснаваўся гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культ. Заданьнем кожнага такога гуртка, як ведаем, ёсьць беларуская культурна-асьветная праца. Вось-жа вышэй названы гурток, маючы так важнае заданьне, прайшоў на працягу свайго блізка дзесяцігадовага йснаваньня запраўды крыжовую дарогу. Ягоная гісторыя ёсьць тыповай для многіх падобных беларускіх арганізацыяў.

Паўстаў успомнены гурток з ініцыятывы трох сьведамых беларусаў і пачаў сваю дзейнасьць у надта цяжкіх варунках. Адразу „здабыў" ён сабе... трох заядлых, няпрыміраных ворагаў. Яны моцна клапаціліся аб тым, каб гурток занадта „ня разышоўся." Адміністрацыйныя ўлады прыглядаліся, каб гэты-ж самы гурток „не загражаў бэзпечэнству публічнэму." І так Гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Іказьні, пад гэткай апекай, пастанавіў на пачатак зладзіць беларускае прадстаўленьне. Спачатку пайшло ўсё, як па масьле: дасталі ад Браслаўскага старасты дазвол на прадстаўленьне, ад войта Перабродзкай вол. — дазвол на памешканьне, у якім мелася быць прадстаўленьне. Пачаліся прыгатаваньні. Але неспадзявана, за тры дні перад прадстаўленьнем, калі ўжо ўсё было прырыхтована, наступае „цофненьце" дазволу войта на будынак пад прадстаўленьне. І вось мусілі наступіць новыя высілкі і новая бескарысная трата энэргіі. Колькі-ж перашкод трэба перамагчы і колькі-ж працы трэба палажыць на сарганізаваньне аднаго толькі беларускага прадстаўленьня. Гэта знае найлепш той, хто сам нераз яго ладзіў.

Беларускіх прадстаўленьняў гурток у Іказьні на працягу свайго існаваньня зладзіў каля 10. Пры кожным прадстаўленьні спатыкаліся рознага роду цяжары, якія каб усе апісаць, дык заняло-б страшна многа і часу і месца. Да таго шмат маем ужо апісаных на старонках беларускай прэсы, але яшчэ і шмат, шмат іх не апублікована.

Хацелася-б аднак успомніць хоць важнейшыя здарэньні.

У 1926 г. пасьля вулічнага збору грашавых ахвяраў на карысьць і мэту гуртка, дайшло да суду. На судзе сябра гуртка быў апраўданы, але мусіў змарнаваць на гэта шмат часу, грошаў і зьнясьці шмат прыкрасьцяў.

У 1927 г. у часе выбараў у Сойм старшыня гуртка ў зьвязку з прадвыбарнай акцыяй прасядзеў тры месяцы з паловай на Лукішках у Вільні.

У 1934 г. Браслаўскі стараста пакараў старшыню гуртка штрафам. Справа гэта цягнулася аж два з паловай гады, пакуль аканчальна ня вырашылася на судзе.

Гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Іказьні стойка змагаўся з цемрай на працягу 10 гадоў. Цяпер ён закрыты адміністрацыйнымі ўладамі за — бяздзейнасьць.

Сябра.

Ciažkija časy.

Hałbieja, Pastaŭskaha paw. Wioska Hałbieja dawoli wialikaja. Žycharami jaje źjaŭlajucca prawasłaŭnyja biełarusy. Ziamli majem nadta mała, tak što z jaje niemahčyma pražyć biez zarabotkaŭ. A zarabotki ŭ nas marnyja: za 75 hr. treba pracawać až da potu 12 hadz. Z kaniom adzin čaławiek moža zarabić za ŭwieś dzień usiaho 1 zł. 20 hr.

Woś dyk nastali časy, i žywi sabie jak chočaš.

P. K.

Пісьмы з вёскі

Ab našym žyćci.

Dwareckaja woł., Nawahradzkaha paw. Sumnyja i strašnyja źjawy šyracca ŭ našaj wołaści i naahuł u našym wiaskowym žyćci — biezziamielle, biezraboćcie, wialikaje hora, złodziejstwa, razboi i zabojstwa — woś prajawy ciažkoha sialanskaha žyćcia.

Niadaŭna ŭ Dwareckaj woł., u w. Krucilawičy krucilaŭskija stralcy prabili nažom sielanina Siomuchu z w. Daniławič, jaki ciapier lažyć, ledź žywy, u špitali ŭ Nawahradku.

Dnia 12 sakawika siol. u miastečku Nowojelni, jak raz u dzień tarhowy, u časie bojki zastralany chłapiec Symon Hrynkoŭski z w. Taŭkunoŭ.

16 sakawika b. h. u miastečku Dwarec u tarhowy dzień zastreleny žychar wioski Dudzičy Čuwak...

Narod dzičeje, prycisnuty strašennaj biadoj — ciažkim materyjalnym pałažeńniem. Nie pamahajuć jamu ni roznyja „kółka," ni „Kasy Stefčyka," ni małačarni z cyntryfuhami, ni ŭsiakija „instruktary" i h. p. Narod užo źniawieryŭsia da ŭsiakaha rodu „dabradziejaŭ," jakija pad pakryŭkaj kulturna-aświetnaj pracy, prawodziać swaje mety.

Sielanin zaciskaje sabie žywot dziahaj i ciarpliwa čakaje...

Kaścioły, dzie panuje polščyna i cerkwy, dzie trymajecca rasiejščyna, świeciać u nas pustkami, bo narod adwiarnuŭsia ad ich, nia čujučy ŭ hetych światyniach ničoha rodnaha — swajho biełaruskaha.

Biełaruskaja nacyjanalnaja świedamaść siarod sialanstwa raście z kožnym dniom.

Sialanie dobra zrazumieli, što ichnaje žyćcio tolki tady palepšycca, kali jany stanucca sami zapraŭdnymi haspadarami swajej ziamli.

„Špak."

З нашага жыцьця.

м. Новы Сьвержань, Стаўпецкага павету. Чытаючы шырока распаўсюджаную на нашых землях „Беларускую Крыніцу," даведываюся амаль што з кожнага яе нумару, як жывецца Беларусам у нашым Краю. Даведываюся з сумам, што жыцьцё гэтае даволі благое. Даведываюся так-жа, што ёсьць натугі „зэўропэізаваць" „мужыкоў" — на дворна-выхованых панкоў, прышчапіць ім „заходнюю культуру."

Уся гэтая акцыя праводзіцца плянова, праводзіцца праз культурныя або харытатыўныя арганізацыі.

Пачынаючы з прошлага году, дзейнасьць гэтых „культурнікаў" далася ў знакі і нашаму мястэчку. Элемэнт у нас, з малымі выняткамі, даволі сьведамы нацыянальна, сьвядомы сваіх правоў і абавязкаў у адносінах да свае Бацькаўшчыны. Да гэтай пары, дзякуючы таму, што мае сярод сябе інтэлігэнтныя адзінкі, абыходзіўся ў культурным жыцьці сваімі ўласнымі сіламі, ладзячы што год па 3—4 спэктаклі, даючы на сцэну мэлёдыйныя, мілагучныя родныя песьні і слухаючы рэфэратаў і лекцыяў у роднай мове.

„Культуртрэгеры-ж" ня мелі спосабу паказацца да нас із сьвятлом „зах. культуры," пры тым якраз тагды клалі ўсе свае сілы на „асьвету" сялян з в. Задвор'е, — заахвочваючы малых і старых у свае культурныя *прыбытні* (Instytut Żeromskiego) булкамі і „цясткамі." Аднак калі фундуш на гэтую справу скончыўся (усё на гэтым сьвеце канчаецца) — „гасьцінныя" для нашых сярмяжнікаў залі, ці вароты да набіраньня „эўропэйскага полыску," сьвяцілі пустатою. Задвор'е аказалася за „дурное," каб прасьвяціцца сьвятлом цывілізацыі, дзеля гэтага пакінулі яго ў супакоі, а самі, маючы гэнэральны штаб у Стоўпцах, перакінуліся 5 км. на захад у наш Н. Сьвержань.

Перадусім занялі ў арэнду на гэтую мэту залю „Пажарнае Каманды," — дзе да гэтай пары концэнтравалася мяйсцовая культурна-асьветная праца.

А потым! — усёроўна як-бы мяшок разьвязаўся. Пасыпаліся арганізацыі... Чаго тут і для каго толькі ня прыдумана?!

Ёсьць для старых і малых, для мужчынаў і кабет; — нават чуў, што быццам мае залажыцца нешта і для сасуноў. Каб не пасудзілі мяне галаслоўным, пералічу для прыкладу хаця некатарыя: мужчыны маюць — „Стшэлец," „Зьвёнзак рэзэрвістув," „Інстытут Жэромскага" ды яшчэ нешта; кабеты — „Коло господынь мейскіх і вейскіх," „Чэрвоны Кшыж" і „Звёнзак працы обыв. кобет" — арганізацыя для сасуноў знаходзіцца ў стадыі закладаньня.

Паўстала да жыцьця пад апекаю воласьці „Сьветліца організацый сполэчных," дзе „культурнікі" і „почцівы людэк" граюць у карты аж да 11 гадз. ночы. Публіка „пасалідней" у карты граць да сялян не прылучаецца — маюць для сябе білярд-амэрыканку.

Адным словам культурна-асьтная праца аж кіпіць!

У нас вядуць і місыйную работу, а вядуць яе каталікі і на карысьць праваслаўнае царквы; у іншых часох і краёх гэта выглядала-б на абсурд — у нас аднак гэтая зьявішча нармальнае, а палягае яно на тым, што кожнаму „рабу божыю," незалежна ад таго хоча ён, ці ня хоча, „даецца" па цэнах зьніжаных „Календаж Православны," а ў сутнасьці справы больш польскі, чымся праваслаўны.

Паміма аднак усіх натугаў, паміма стасаваньня ўсіх магчымых пад сонцам сродкаў каб перамаляваць сьвержанцаў, яны як на злосьць, цьвёрда, за выняткам пару рэнэгатаў, трымаюцца сваёй беларускасьці — доказам чаго можа служыць, між іншым, ладжанае 8 I.36 праз Бел. Студ. Саюз прадстаўленьне, на якім адыграна было „Суд" Галубка, і канцэрт хору.

Артысты-аматары адыгралі прадстаўленьне вельмі лоўка. На спэцыяльную заўвагу заслугоўвае ігра С. Сьнежкі (Авечка), М. Драздоўскага (Гарбуз), А. Сянкевіча (пісар), П. Гузоўскага (старшыня), З. Дубатоўчыхі (Гарбузіха), В. Мазуркевіча (стораж) і В. Баўдзея (судзьдзя). Перапоўненая па берагі вялікая заля аж трашчала ад воплескаў. Хор пад к'раўніцтвам гр. В. Шчорса зачараваў мілагучнасьцю беларускай песьні ўсіх прысутных; некаторыя песьні на агульнае жаданьне хор павінен быў выконваць двойчы і тройчы... а прысутныя усё-б, здаецца, слухалі і слухалі без канца. Вечар у сымпатычным настроі скончыўся скокамі а 5 гадз. раніцы.

У сучасны мамэнт сьвержанская моладзь рыхтуецца да пастаноўкі п'есы „Для бліжніх." Спэктакль лучна з канцэртам хору адбудзецца 13 красавіка. Канчаючы, заклікаю сьвержанскую моладзь і ўсю беларускую моладзь наагул да далейшае актыўнае працы на ніве культурна-нацыянальнага нашага адраджэньня. Супольнымі сіламі, дарагая моладзь, зможам асягнуць усё — дзеля гэтага працуй, вучыся, трымайся мовы сваіх прадзедаў, ня ідзі за зводным вонкавым блыскам рознае масьці бліхтру, не абівай парогаў сьветліцаў, дзе цябе трактуюць як нешта ніжэйшае, а цэмэнтуйся, твары ўласныя арганізацыі, як напр. Гурткі БІГіК. Ідучы па гэтым толькі шляху, выканаем добра свой нацыянальны абавязак у адносінах да нашага Народу і шматпакутнае Бацькаўшчыны.

Памятай! У еднасьці сіла!

Старэйшы.

Вішнева, Вялейскага пав. У нашай мясцовасьці здарыўся 20 сакавіка сёлета асаблівы, нешчасьлівы выпадак: на рэчцы Смолцы, ў мясцовасьці названай „Галодніцкі млын," на тракце бярэжныя-Чэрані — Сьвір, у часе пераезду сялян на кірмаш, заламаўся пад імі застарэлы, гнілы ўжо мост — людзі разам з коньмі і наладованымі ўсялякім дабром вазамі ўваліліся ў рэчку, з якой ледзь выратаваліся, пры гэтым людзі і жывёла пакалечыліся.

У Вішнеўскай вол. сядзіць некалькі чалавек „драговых." Паліцыя-ж у нас зорка сачыць за „парадкам"...

Тутэйшы.

Bolš światła na wiosku.

Ukropienka, Wojstamskaj woł., Wialejskaha paw. Mnie zdarajecca być u roznych miascowaściach i bačyć, jak našaja moładź u niekatorych miascoch wiadzie kulturna-aświetnuju pracu, a ŭ niekatorych wioskach biełaruskaja moładź prosta marnuje čas — pje harełku, hulaje ŭ karty i časta pamiž saboju bjecca.

Kab spynić demoralizacyju biełaruskaj moładzi na wioscy, kab skirawać jaje na dobruju, prawielnuju darohu, treba dać joj bolš światła — aświetu i nawuku ŭ rodnaj mowie, pradusim ža biełaruskuju knižku i hazetu. Heta budzie najlepšaja strawa dla maładoj biełaruskaj dušy.

U ciažkich ciapierašnich abstawinach rabić heta najlepš mohuć biełaruskija biblijateki-čytalni, jakich treba jaknajbolš zakładać na wioscy. Takaja biblijateka-čytalnia — heta ciapier, swajho rodu, peŭny centr kulturna-aświetnaha žyćcia na wioscy.

U nas takim centram źjaŭlajecca biełaruskaja biblijateka-čytalnia ŭ Smarhoniach. Raźwiwajecca jana dawoli pamysna — z kožnym miesiacam lik knižak i čytačoŭ pawialičwajecca. Moładź, nawat z polskich arhanizacyjaŭ, achwotna čytaje biełaruskija knižki i hazety, praz heta chutka ŭświedamlajecca nacyjanalna i biarecca za pracu na biełaruskaj adradženskaj niwie.

Našaja moładź pastanawiła sioleta na Wialikdzień zładzić biełaruskaje pradstaŭleńnie j ŭžo prystupiła da sarhanizawańnia jaho.

Zaklikaju ŭsiu niaświedamuju biełaruskuju moładź pradusim čytać rodnuju knižku, jakaja wyhanie z wioski ciemru i raspustu, a ŭwiadzie rodnuju biełaruskuju kulturu!

Dyk bolš światła na wiosku!

M. S—cki.

Ярэўшчына, Маладэчанскага пав. Моладзь нашая — ўся нацыянальна сьведамая; чытае беларускія кніжкі і газэты і сьпявае родныя песьні.

Дня 23 лютага сёлета была вечарына, на якой моладзь гуляла спакойна, пяяла беларускія песьні, а некаторыя дэклямавалі вершы нашых найбольшых песьняроў Я. Купалы і Я. Коласа. Вечарына гэна закончылася аднак вельмі сумна, бо арыштам 23 чалавек, якіх паліцыя пагнала ў Маладэчна, дзе было сьледзтва над імі двое сутак, пасьля якога сфатаграфаваўшы ўсіх паасобку і па пяць чалавек, выпусьцілі на волю.

Прысутны.

Naša pošta

Zorka. Dziakujem, pa mahčymaści karystajem.

Chudnicki. Atrymali, dziakujem, karystajem, prośbu spoŭnili, pišycie čaściej.

Prysutny. Karystajem, pišycie bolš.

Sawicki. Atrymali, dziakujem, karystajem.

Tutejšy II. Dziakujem, pišycie čaściej.

Pinčuk. U prošłym numary Waš artykuł skanfiskawany, nastupny atrymali, dziakujem.

Paddubič. Atrymali, dziakujem, wykarystajem, u „Kałośsie" pieradali.

Čyžyk. Karaspandencyju nadrukujem, hazetu budziem wysyłać.

Бацькі Беларусы! Вучэце сваіх дзетак беларускае граматы! Дамагайцеся роднае беларускае школы!

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič